**Старшыня**. Слова для паведамлення ад імя ЦК КП(б)Б мае Сакратар ЦК тав. Валковіч (гучныя а п л а д ы с м е н т ы, усе ўстаюць).

**Валковіч.** Вы сёння чыталі ў газетах паведамленне Пракуратуры рэспублікі. Зараз кожнаму з вас ясна, што непасрэднымі натхніцелямі забойства таварыша Кірава, накіраваўшымі дула рэвальвера гнуснага забойцы ў аднаго з лепшых людзей нашай партыі, у аднаго з лепшых сыноў нашай соцыялістычай бацькаўшчыны, былі Зіноўеў і Каменеў.

Таварышы, мы, комуністы, рабочыя, калгаснікі і ўсе лепшыя прадстаўнікі працоўных нашай БССР, усім сэрцам адчуваем трагічны стрэл у Смольным. Стрэл здраднікаў нашай соцыялістычнай краіны гнусных падляцоў, страціўшых людское аблічча, даўно скаціўшыхся ў агульную памыйную яму белагвардзейшчыны. Яшчэ па ўсёй краіне грыміць гнеў шматмільённых мас, змёўшы з твару зямлі забойцаў, злоўленых на месцы злачынства. Па ўсяму вялікаму Совецкаму Саюзу ад краю да краю ідзе слава аб партыі Леніна—Сталіна, слава аб нашым вялікім правадыры тав. Сталіне, вакол якога яшчэ цясней згуртаваліся масы.

Таварышы, сёння ў матэрыялах, апублікаваных у друку, мы чыталі бессаромныя прызнанні ворагаў: «мы варыліся ва ўласным сваім саку, атручваючы атрутай нашых контррэволюцыйных поглядаў і пераконанняў сваіх аднадумцаў. Гнусныя плёткі намі мусіраваліся і распаўсюджваліся ў масах. Мы з вялікай радасцю падхаплялі чуткі аб разгалоссях ў ЦК, з імі мы звязалі свае надзеі на трэшчыну ў кіраўніцтве партыі. Гэтымі настроямі мы акрылялі звязаных з намі людзей».

Далей адзін з групы Зіноўева і Каменева гаворыць: «Калі нам ставіць у віну тэрарыстычныя настроі, я цвёрда заяўляю: так, за гэта мы павінны несці адказнасць, бо тая атрута, якою мы атручвалі акружаючых нас на працягу дзесятка год, спрыяла злачынству, забойству тав. Кірава».

У сваёй заяве Зіноўеў гаворыць, што яго палохае думка быць нароўні з забойцамі і бандытамі. Мяне таксама гэта палохае, гаворыць Каменеў. Ён таксама гаворыць, што «я і другія вінаваты ў тым, што сістэматычна атручвалі свядомасць людзей і зараз павінны несці за гэта адказнасць».

Урэшце, яшчэ адно месца: «Мы так прывыклі ілгаць партыі, што... адвыклі адрозніваць праўду ад ілжы. Калі Зіноўеў з трыбуны XVII з'езда рабіў аналіз контррэвалюцыйнасці нашых пазіцый 1925-27 г. г., там была толькі палова праўды. Другая праўда, якой не хапала, гэта тое, што ў партыі захаваліся ворагі, гэтыя ворагі захавалі партбілеты для таго, каб змагацца з партыяй, Зіноўеў павінен быў аб гэтым заявіць з'езду».

Бачыце, таварышы, гэтыя людзі, ашукваючы партыю, ва ўвесь голас запэўнялі нас у тым, што яны ўсвядомілі свае памылкі і адначасова ядавітым шопатам штодзённа, штогадзінна выхоўвалі сваіх вырадкаў паследкаў у нянавісці да партыі і яе правадыроў. Так выраслі гэтыя жудасныя дзеці апусціўшыся ў смярдзючы бруд бацькоў і паднялі сваю чорную руку супроць партыі. Самага суровага пакарання, самага зніштажальнага ўдару мячом пралетарскай дзяржавы заслужылі яны.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы